Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 103 (29983)

УКАЗ, ЯКІ ЧАКАЛІ ДАЧНІКІ 2

ЦЯЖАРНАСЦЬ У 35–40 АМАЛОДЖВАЕ 5

Лета. Сонца. Канікулы!

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Юныя жыхары вёскі Грабаўка Гомельскага раёна: Аляксандр КАЦАЛАПАЎ, Софія МЕЛЬНІКАВА і Мілена ВАСКУН.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль МАРКЕВІЧ, міністр культуры:

«Сённяшняя моладзь — гэта заўтрашнія кіраўнікі, тыя людзі, што будуць вырашаць шмат пытанняў і праблем, якія ўзнікаюць, якія дыктуе само жыццё. Наша будучыня залежыць ад таго, наколькі мы зможам выхаваць падрастаючае пакаленне і залажыць у яго аснову праз традыцыі, вялікую гісторыю, разумненне сённяшняга дня. Важна прывучыць шанаваць тое, што маем, — цудоўную зямлю, сваю малую радзіму, а таксама выхаваць пачуцці любові, дабрыні і павагі да старэйшых. Тут не можа быць другарадных тэм».

КАРОТКА

- Стаўка рэфінансавання зніжана да 9,75 % гадавых.
- **На БелАЭС пачаўся этап доследна-прамысловай эксплуатацыі другога энергаблока.**
- Забароны на паведванне лясоў уведзены ва ўсіх абласцях Беларусі.
- **Энергазабеспячальныя арганізацыі з 1 ліпеня пачнуць работы па абследаванні электрасетак садовых таварыстваў.**
- Музычны фестываль ROCK orchestra FEST адбудзецца ў Мінску 8 чэрвеня.
- **НАН Беларусі аб'явіла конкурс на суісканне прэмій для маладых вучоных.**
- МНС пачне авіяпатруляванне месцаў масавага адпачынку каля вады ў хуткім часе.
- **У Беларусі адпачыла і аздаравілася больш за тры тысячы дзяцей з Данбаса.**

Дзяржаўны інтарэс

ТЭХНАЛОГІІ, ШТО НАКОРМЯЦЬ

Чаму пабываць на «Белагра-2023» варта нават тым, хто далёкі ад аграрнай сферы

Беларусь — аграрная краіна, і ў нашы дні гэта гучыць горда: у трэцім тысячагоддзі сельская гаспадарка — тая сфера, у якую дзяржавы ўкладваюць сродкі, а найлепшыя галовы — навукоўцы і даследчы патэнцыял. У сучасным свеце, насельніцтва якога складае каля 8 мільярдаў, харчовая бяспека выходзіць на першы план.

Канцэпцыя высокатэхналагічнай, або, як прынята казаць, разумнай сельскай гаспадаркі — выкарыстанне камп'ютарных праграм і складанага абсталявання для аптымізацыі працэсаў земляробства, раслінаводства, жывёлагадоўлі, атрымання малака і мяса — укараняецца ў яшчэ і ў нашай краіне: гарантаваны ўзровень харчовай бяспекі застаецца адным з асноўных нацыянальных прыярытэтаў Беларусі. Асаблівасці такога падыходу да аграрных работ прафесіяналам будуць цікавыя з практычнага пункту гледжання, а тым, хто не звязаны з аграрнай сферай, — з пункту гледжання пазнавальнага. Тым больш што Міжнародная спецыялізаваная выстава «Белагра» штогод праходзіць не толькі як форум прафесіяналаў, але і як яркае шоу, дзе можна ўбачыць новыя пароды сельскагаспадарчых жывёл, пакаштаваць найноўшыя лініі прадукцыі ад айчынных і замежных вытворцаў і на свае вочы ацаніць інавацыйныя тэхналогіі ў агратэхніцы, раслінаводстве, жывёла- і птушкагадоўлі. А таксама — шырокі спектр магутнай сельгастэхнікі апошняга пакалення. Сёлета ў экспазіцыі выставы — больш за 240 новенькіх бліскучых сельгасмашын, якія выкарыстоўваюць ва ўсіх галінах сельскай гаспадаркі (ад тых, што здзіўляюць сваімі памерамі, да зусім малютак). Наведвальнікам дазволяць пасядзець у іх кабінах — так што на выставу варта прыйсці з дзецьмі.

СТАР. 3

Эх, лета!

ВАБІЦЬ БЕЛЕНЬКІ ПЯСОЧАК ЛЯ РАКІ...

На Гомельшчыне паводка ўнесла свае карэктывы ў тэрміны падрыхтоўкі пляжаў да купальнага сезона. На значнай іх частцы вадалазы ўжо даследавалі дно — пляжы ачышчаны ад смецця, занесенага вялікай вадой, і адкрытыя для плавання. Але ёсць зоны адпачынку, дзе ўзровень паводкавых водаў дагэтуль не дазваляе скончыць такую работу.

СТАР. 13

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ДАЧНЫЯ ЭЛЕКТРАСЕТКІ — НА ДЗЯРЖАЎНЫ БАЛАНС, ЧЛЕНСКІЯ ЎЗНОСЫ — ПРАЗ АГУЛЬНЫ СХОД

Што яшчэ зменіць дакумент, які чакалі многія

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 155 «Аб садаводчых таварыствах», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Дакумент накіраваны на ўстараненне назапашаных з улікам практыкі дзейнасці садаводчых таварыстваў прабелаў і супярэчнасцяў у заканадаўстве, спрашчэнне вырашэння многіх пытанняў, якія датычацца іх унутранай арганізацыі, удасканаленне падыходаў да знешняга кіравання таварыствамі, стварэнне ўмоў для развіцця іх інфраструктуры, навядзенне парадку на тэрыторыях.

Указам **уводзіцца магчымасць перадачы на баланс дзяржаўных энергазабеспячальных арганізацый высакавольтных электрасетак таварыстваў па фактычным стане незалежна ад тэрміну іх уводу ў эксплуатацыю.**

Прадугледжваецца таксама **парадак перадачы ўнутраных сетак з наступным заключэннем прамых дагавораў электразабеспячэння з грамадзянамі — членамі таварыстваў.** Такая перадача будзе ажыццяўляцца пры ўмове знаходжання электрасетак у тэхнічна спраўным стане і ўстаноўкі (наяўнасці) вынасных прыбораў уліку расходу электраэнергіі.

Прыём у дзяржаўную ўласнасць электрычных сетак таварыстваў дасць магчымасць забяспечыць іх надзейную і бяспечную эксплуатацыю за кошт якаснага абслугоўвання спецыялізаванымі арганізацыямі, а **члены таварыстваў змогуць прымяняць тарыф на спажываную электраэнергію як для жыллёвага фонду.**

З улікам практыкі правапрымянення, а таксама меркавання грамадзян зменены **падыходы да фарміравання памераў членскіх узносаў.** Існуючыя нормы аб іх спагнанні незалежна ад памераў зямельных участкаў скарэкціраваны. Указам **дадзена права агульным сходам садаводчых таварыстваў самастойна прымаць рашэнні па згаданых пытаннях.**

Зыходзячы з запытаў на месцах і зваротаў грамадзян, а таксама грамадскай думкі аб павышэнні ролі дзяржавы ў сферы кантролю за дзейнасцю садаводчых таварыстваў, указам **мясцовыя органы ўлады надзяляюцца правам прызначаць старшыню праўлення таварыства** ў выпадку яго працяглай адсутнасці, а таксама асобнымі паўнамоцтвамі па бягучым кіраванні таварыствамі (напрыклад, патрабаваць правядзення пазачарговага агульнага сходу).

Для садаводчых таварыстваў **уводзіцца магчымасць атрымліваць у мясцовым выканкаме (на бязвыплатнай аснове) інфармацыю** аб адабранні і выдзяленні зямельных участкаў, аб дзяржаўнай рэгістрацыі пераходу правоў на зямельныя ўчасткі або доляў у праве на іх. Гэта будзе садзейнічаць вядзенню актуальнага ўліку членаў таварыстваў, рэалізацыі іх правоў і абавязкаў, выкананню правілаў унутранага распарадку, статута таварыства, выплаце ўзносаў, зямельнага падатку, падатку на нерухомую маёмасць і г. д.

Акрамя таго, дакументам **вызначаны парадак прыняцця членамі таварыства рашэння аб уключэнні яго тэрыторыі ў мяжу населенага пункта або ўтварэння на яго базе населенага пункта.**

Урэгуляваны пытанні, звязаныя з паступленнем у камунальную ўласнасць безгаспадарных садовых домікаў, а таксама адлюстраваны асаблівасці адчужэння садовых домікаў (доляў у праве на іх), прызнаных безгаспадарнымі або вымарачнай спадчынай. Таксама **ўрэгуляваны пытанні членства ў таварыствах асоб, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі долевай уласнасці, пажыццёвага спадчыннага валодання або арэнды зямельнага ўчастка** (у выпадку атрымання ў спадчыну або пераходу правоў на зямельны ўчастак у долях).

Указам **уведзена магчымасць прыцягнення аўдытарскай арганізацыі або аўдытара для ўнутранага кантролю за дзейнасцю таварыства. Пашыраны і канкрэтызаваны пералік дакументаў, з якімі могуць знаёміцца члены таварыства** (са статутам, каштарысамі даходаў і расходаў, справаздачамі старшыні праўлення і рэвізійнай камісіі, пратаколамі агульных сходаў (сходаў упаўнаважаных), іншымі дакументамі таварыства).

Установлены дадатковыя меры для навядзення парадку на тэрыторыі таварыстваў (у прыватнасці, правядзенне інвентарызацыі ўчасткаў не радзей як адзін раз у тры гады).

Указ уступае ў сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання.

«ПАПЯРЭДЗІЦЬ ПРАСЦЕЙ, ЧЫМ ЛІКВІДАВАЦЬ»

Вадзім СІНЯЎСКІ расказаў, на чым у цяперашні час сканцэнтравана ўвага ратавальнікаў

Аднак перш чым ахарактарызаваць аператыўную абстаноўку, міністр па надзвычайных сітуацыях уручыў узнагароды пераможцам і лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу на найлепшае асвятленне ў СМІ дзейнасці МНС і асноў забеспячэння бяспекі жыццядзейнасці. Узнагароду з рук кіраўніка ведамства атрымала і рэдактар аддзела газеты «Звязда» Вераніка Канюта. Журналістка заняла першае месца ў намінацыі «Найлепшы аўтар».

Фота прэс-службы Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.

У размове з журналістамі Вадзім Сіняўскі абазначыў ключавыя задачы, асабліва актуальныя для ведамства ў найбліжэйшы час. «Аператыўная абстаноўка ў галіне папярэджання і прафілактыкі надзвычайных сітуацый у краіне дастаткова стабільная, — адзначыў міністр. — Нам удаецца ўтрымліваць нядрэнную дынаміку скарачэння гібелі людзей на пажарах. Вельмі разлічваем, што захаваем яе на працягу ўсяго года, але для гэтага трэба вельмі актыўна працаваць».

Па словах кіраўніка ведамства, другі кірунак, на які скіравана асаблівая ўвага ратавальнікаў, — папярэджанне гібелі людзей на вадзе. «Пачынаецца купальны сезон, — удакладніў ён. — На жаль, статыстыка паказвае, што ўжо цяпер мы маем павелічэнне колькасці загінулых на 30 чалавек у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. У кожным выпадку — жыццё чалавека. Для нас самае галоўнае — выратаваць чалавека, папярэдзіць яго, каб ён не трапіў у бяду. Формы і метады ў нас тыя ж. Ужо пачалі працаваць па апаяўшчэнні насельніцтва аб небяспецы знаходжання каля вадаёмаў. У хуткім часе пачнём выкарыстоўваць авіяцыйнае патруляванне месцаў масавага адпачынку людзей і правядзенне там прафілактычных мерапрыемстваў па недапушчэнні знаходжання каля вадаёмаў у стане алкагольнага ап'янення, купання ў неўстаноўленых месцах і іншае».

Вадзім Сіняўскі заўважыў, што ў лясах — фактычна ва ўсіх рэгіёнах краіны — захоўваецца высокі ўзровень пажарнай небяспекі. «Таму ў першую чаргу важнае выкананне мер бяспекі, недапушчэнне распальвання вогнішчаў і выкарыстання мангалаў у лясах, таксама трэба чуць і выконваць забароны на наведванне лясоў у пажаранебяспечны перыяд», — рэзюмаваў міністр па надзвычайных сітуацыях.

Вера АРЦЕМ'ЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнтам Латвіі выбраны дзеючы кіраўнік МЗС Эдгарс Рынкевічс

Сейм Латвіі 31 мая ў трэцім туры галасавання выбраў прэзідэнтам краіны дзеючага кіраўніка МЗС Латвіі Эдгарса Рынкевічса. Аб гэтым паведамляецца на сайце латвійскага парламента.

Кандыдатуру Рынкевічса падтрымалі 52 дэпутаты, супраць прагаласавалі 35 парламентарыяў. Прэзідэнт выбіраецца абсалютнай большасцю галасоў дэпутатаў (51 голас са 100) тэрмінам на чатыры гады.

На пасаду прэзідэнта Латвіі, акрамя Эдгарса Рынкевічса, прэтэндаваў палітык і архітэктар Улдзіс Піленс, а таксама актывістка латышскай дыяспары ў Еўропе і эксперт па публічным кіраванні Эліна Пінта.

Кіруючы альянс Эрдагана атрымаў большасць месцаў у парламенце Турцыі

«Рэспубліканскі альянс» на чале з Партыяй справядлівасці і развіцця (ПСР) прэзідэнта Рэджэпа Таіпа Эрдагана атрымаў 323 месцы з 600 у парламенце Турцыі. Аб гэтым паведаміў кіраўнік Цэнтрвыбаркама краіны Ахмет Енер, паведамляе ТАСС.

У адпаведнасці з канчатковымі данымі, Партыя справядлівасці і развіцця атрымала 268 месцаў, Новая партыя росквіту — 5, Партыя нацыяналістычнага руху — 50 (дадзеныя партыі ўваходзяць у «Рэспубліканскі альянс»), Народна-рэспубліканская партыя — 169 месцаў, Добрая партыя — 43. Турэцкая рабочая партыя атрымала чатыры мандаты, а Партыя зялёных левых — 61 крэсла.

Выбары ў парламент Турцыі прайшлі 14 мая адначасова з першым турам выбараў прэзідэнта краіны.

Блізкая ўлада

У ФАРМАЦЕ ШЧЫРАЙ РАЗМОВЫ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з працоўным калектывам ТАА «Еўрагандаль». На сустрэчы прысутнічалі прадстаўнікі кампаніі з усіх рэгіёнаў краіны, а гэта каля 270 чалавек.

Сустрэча працягвалася каля дзвюх гадзін, паведамляе БелТА. Быў абраны фармат шчырай, даверлівай размовы, падчас якой Наталля Качанава давяла інфармацыю аб палітычным, сацыяльна-эканамічным жыцці краіны. У прыватнасці, спікер расказала, над чым працуюць члены Савета Рэспублікі пры рэалізацыі задач, абазначаных у ходзе VI Усебеларускага народнага сходу, Паслання кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і парламенту. Закраналіся пытанні заканадаўчага рэгулявання, суверэнітэту, развіцця рэгіёнаў, цэнаўтварэння, сямейнай і маладзёжнай палітыкі, адукацыі, аховы здароўя, дзейнасці палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Гаворка таксама ішла аб ролі кожнага грамадзяніна ў пабудове моцнай дзяржавы. Члены працоўнага калектыву цікавіліся і асабістым жыццём спікера, яе перавагамі, напрыклад у літаратуры.

Наталля Качанава падкрэсліла, што на такіх сустрэчах прадстаўнікі дзяржаўных органаў не толькі даносяць інфармацыю, але яшчэ і камунікуюць з людзьмі, адказваюць на іх пытанні. «Вядома, для мяне гэта заўсёды вялікая радасць. Мне заўсёды прыемна бываць у працоўных калектывах, сустракацца з людзьмі. Для нас гэта вельмі важна, бо мы можам пачуць як рэальную сітуацыю, якая складваецца на канкрэтным прадпрыемстве, так і тое, што хвалюе нашых людзей. Таму такія сустрэчы ўзаемаўзбагачаюць», — адзначыла спікер.

Па сутнасці

ЧУЖЫХ ДЗЯЦЕЙ НЕ БЫВАЕ

Кажуць, птушкі — добры індыкатар навакольнага асяроддзя. Па колькасці птушыных насельнікаў можна ацаніць не толькі экалагічны стан мясцовасці, але нават і палітычную атмасферу. Тут няма ніякага пафасу. Кажуць, на Данбасе спачатку зніклі птушкі, а пасля — паляцелі снарады. Крылатыя вешчуны адчуваюць людзей, мясцовасць і нават падзеі, што маюць адбыцца... А да нас з выраю ляцяць чароды птушак. Жаваранка і салаўя можна пачуць нават у цэнтры сталіцы. Значыць, добра ім тут, маленькім і большым. І ў нас у краіне, значыць, усё нядрэнна.

Пад беларускім мірным небам снуюць ластаўкі, а над вёскамі ды аграгарадкамі лунае клёкат буслоў і птушыны шчэбет дзі посвіст. Чуваць у гэтым хоры і зязюлю. Да Пятра — сярэдзіны лета — яна часта «сігналіць» аб сваёй бядзе. Згубленых, пакінутых дзецях. Вось так і ў людзей, нават сярод краін. Сімвал Беларусі, код нацыянальнага характару — гняздо бусла. У нас клёкат бусла — шматдзетнасць, будоўля, сяўба. У паўднёвых суседзяў, на жаль, — іншае. Вайна да апошняга жыхара. Не звважаючы, дарослы або дзіця. А дзеці Данбаса ў гэтай вайне нарадзіліся і растуць, становяцца дарослымі. Многія з іх ужо і не ведаюць, як гэта — калі мір.

Хоць на колькі часу ажыць, аднавіць сваё дзяцінства юным жыхарам Данбаса дапамагаюць беларусы. Усе. Людзі ў высокіх сталічных кабінетах, цэлыя грамадскія аб'яднанні з абласных цэнтраў і асобныя актывісты з рэгіёнаў, нават прыхаджане мінскіх і гродзенскіх храмаў збіраюць падарункі для дзяцей суседзяў. Карацей, уся Беларусь. Сам быў сведкам, як з фанфарамі і ў касцюмах казачных герояў цягнік з дзецьмі вайны сустракалі беларускія міліцыянеры. Ад цёплага прыёму горача нават на лядовай пляцоўцы. Памятаеце, як хораша і лагодна Прэзідэнт сустракаў чарговых юных гасцей з тэрыторыі вайны?

Мы не можам інакш. Не толькі таму, што нам баліць за гэтых дзяцей, як за сваіх уласных. Нам яшчэ баліць за дзяцей Хатыні і Краснага Берага. А цяпер нашчадкі тых, хто кідаў нашых дзяцей у вогнішча, хто разам з мамамі закопваў іх жывымі ў зямлю і гнаў у гнілое балота Азарычаў, хто забіваў немаўлят аб рог іх роднай хаты і выпівай з іх крыві да апошняй кроплі ў пекле канцлагераў, спрабуюць абвінаваціць нас, што мы дзяцей Данбаса выкрадаем, вывозім іх з родных мясцін супраць волі іх бацькоў... Шляхта Еўропы ў шляхетнай сядзібе, якая сваіх дзяцей ператварае ў істот аморфнай шкалы гендарызацыі. І яны разыўляюць ляпу на Беларусь за тое, што наша краіна не стаіць у баку ад дзіцячых слёз. Слёз галодных дзяцей кала калючага дроту, праз які «гуманісты» назіралі за адурманенымі іх жа абяцанкамі бежанцамі з краін, якія яны, «гуманісты», і разбурылі...

Беларусь не стаіць у баку ад слёз дзяцей Данбаса, што за свае гады жыцця не бачылі міру і не чулі цішыні... А памятаеце, як спраўна паскудзілі фэйкамі ў 20-м пра нібыта скалечаную дзяўчынку падчас пратэстаў? Хутка выявілася — хлусня. Але ж «гуманісты» ўсіх масцей працягвалі енчыць: гвалт! Хочацца спытаць у іх: чаму не крычыце пра Алею анёлаў — забітых вайной дзяцей — у Данецку? Ці гэта іншае? Ці лепш і галоўнае — больш матэрыяльна выгадна абліваць граззю нашу краіну за тое, што мы прымаем дзяцей Данбаса? Маўляў, укралі. Ад чаго, ад каго? Ад вайны! Гэта трэба абавязкова зразумець. Найперш нам самім, бо тым, хто трымае дзяцінства пад прыцэлам, нічога не дакажаш. Дый ці трэба?

Перафразуючы вядомае выказванне, «скажыце, як краіна адносіцца да дзяцей, і я скажу, што гэта за краіна». Беларусь — краіна шчаслівага дзяцінства. З клёкатам буслоў, свежым ворывам на палетках ад трактарных плугоў, а не танкавых тракаў, і каруселямі.

І якімі б ілжывымі заявамі ні спрабавалі ўджаліць палітычныя фарысеі Захаду, што б ні выдумлялі «праваабаронцы» трансгендарнай дэмакратыі... Няхай сабе лаюцца. А наша дзятва, дзякуй богу, шчабеча і будзе шчабятаць. І Беларусь была, ёсць і застанецца краінай шчаслівага дзяцінства. Не толькі для нашых дзяцей, бо мы не забыліся, што іх, дзяцей, чужых не бывае.

Яўген ПУСТАВОЙ.

Парламенцкі дзённік

ЗМЯНЕННІ, ПРАДЫКТАВАНЫЯ ЧАСАМ

Дэпутаты разгледзелі змяненні ў Закон «Аб сродках масавай інфармацыі» і адобрылі Закон «Аб народным апалчэнні»

І калі законапраект, якім уносяцца карэктывы ў дзейнасць медыйнай сферы, у Авальнай зале чыталі ўжо другі раз, то Закон «Аб народным апалчэнні» парламентарыям быў прадстаўлены ўпершыню. Увогуле, гэта першы падобны законапраект у нашай краіне — сучасная абстаноўка ў свеце патрабуе павышанай увагі да пытання абараназдольнасці.

УСЕНАРОДНЫ ХАРАКТАР АБАРОНЫ

Праект закона, які падрыхтаваны Міністэрствам абароны, накіраваны на ўстанаўленне прававых асноў рэалізацыі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны, права на добраахвотны ўдзел у забеспячэнні ваеннага становішча ў Беларусі. У прыватнасці, праектам закона вызначаюцца тэрміны «народнае апалчэнне», «атрад народнага апалчэння» і «добраахвотнік народнага апалчэння», агульныя пытанні фінансавага і матэрыяльнага забеспячэння народнага апалчэння. Прадугледжаны абмежаванні пры залічэнні грамадзян у народнае апалчэнне, а таксама парадак кіраўніцтва народным апалчэннем, фарміравання, камплектавання і дыслакацыі атрадаў народнага апалчэння, выканання імі задач. Прапісаны паўнамоцтвы дзяржаўных органаў і службовых асоб у сферы дзейнасці народнага апалчэння.

— Аналіз сучасных войнаў сёння дазваляе зрабіць выснову, што абарона Айчыны павінна насіць усенародны і масавы характар. Менавіта такія задачы і вырашае Закон Рэспублікі Беларусь «Аб народным апалчэнні», — падкрэсліў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Яўген ЗАЙЦАЎ**. — Прыняцце дадзенага законапраекта дасць магчымасць стварыць неабходныя ўмовы для падтрымання правапарадку на адміністрацыйных тэрыторыях, захавання маёмасці грамадзян, юрыдычных асоб усіх формаў уласнасці, а таксама для аказання садзейнічання тэрытарыяльным органам унутраных спраў у забеспячэнні мерапрыемстваў ваеннага становішча. Вядома, гэта дасць магчымасць грамадзянам добраахвотна браць удзел ва ўзброенай абароне свайго дому, родных і блізкіх, свайго населенага пункта, хатняга ачага — і такім чынам удзельнічаць ва ўзброенай абароне нашай дзяржавы.

ПАВЫШЭННЕ АДКАЗНАСЦІ Ў ІНФАРМАЦЫЙНАЙ І ВЫДАВЕЦКАЙ ПРАСТОРЫ

Законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі», адобраны парламентарыямі ў другім чытанні, накіраваны на забеспячэнне канстытуцыйнага права грамадзян на атрыманне поўнай і дакладнай інфармацыі, абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, нацыянальнай бяспекі ў сферы масавай інфармацыі. У ходзе падрыхтоўкі да разгляду ў другім чытанні ў тэкст праекта закона ўнесены праўкі ўдакладняльнага і тэхнічнага характару. У прыватнасці, ліквідаваны супярэчнасці паміж асобнымі нормамі Закона «Аб сродках масавай інфармацыі» і Указа Прэзідэнта ад 22 сакавіка 2022 года № 116 «Аб навінавых агрэгатарах у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт».

У першым чытанні разгледжаны законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь». Дакумент распрацаваны з мэтай удасканалення прававога рэгулявання грамадскіх адносін у сферы выдавецкай справы. Асноўныя палажэнні праекта накіраваны на пашырэнне пераліку падстаў для перарэгістрацыі выдаўцоў і вытворцаў друкаваных выданняў, а таксама пераліку падстаў для прыпынення і спынення дзеяння пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друкаваных выданняў. Акрамя таго, пашыраюцца паўнамоцтвы Міністэрства інфармацыі, у тым ліку ў прыняцці рашэння аб спыненні дзеяння пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі для выдаўцоў друкаваных выданняў.

РЭФОРМА ДЛЯ БІЗНЕС-СУПОЛЬНАСЦІ

У першым чытанні парламентарыі адобрылі праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці».

Як адзначыў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Анатоль НАСЕНЯ**, законапраект прайшоў беспрэцэдэнтнае абмеркаванне ў грамадстве з прыцягненнем практычна ўсіх катэгорый бізнес-супольнасці: ад індывідуальных прадпрымальнікаў да прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу. «Нават буйны бізнес з задавальненнем падключыўся да абмеркавання гэтага законапраекта, — заўважыў дэпутат. — Што больш за ўсё цікавіла прадстаўнікоў бізнесу? Асноўны пасыл, закладзены ў законапраекце, — тыя напрамкі, у якіх індывідуальныя прадпрымальнікі сапраўды змогуць сябе рэалізаваць, працуючы далей, не жадаючы трансфармавацца ў камерцыйную арганізацыю: гэта значыць, чым яны змогуць займацца і на якіх умовах тое будзе».

«Па-ранейшаму застаюцца актуальнымі і патрабуюць дапрацоўкі, вывучэння пытанні адносна мікраарганізацый, — паведаміў Анатоль Насеня. — Законапраектам прадугледжана выключэнне дадзенай катэгорыі. Аднак мы мяркуем, што малыя камерцыйныя арганізацыі колькасцю да 50 чалавек будуць мець тыя правы, якія былі для мікраарганізацый. Гэта значыць захоўваем найбольш лаяльны рэжым функцыянавання. Застаюцца адкрытымі пытанні па камунальных паслугах. Законапраектам прадугледжана, што юрыдычны адрас у індывідуальнага прадпрымальніка пры трансфармацыі застаецца па месцы жыхарства. Згаданае пытанне таксама патрабуе некаторай дапрацоўкі, у тым ліку з прадстаўнікамі ЖКГ. Законапраектам заяўлена тое, што такая трансфармацыя будзе адбывацца ў кароткія тэрміны, гэта будзе бясплатна».

Дэпутат падкрэсліў, што ў цэлым рэформа бізнес-супольнасцю ўспрымаецца канструктыўна.

ДЛЯ РЭДКІХ ПАТАЛОГІЙ — БЯСПЛАТНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ ЗА МЯЖОЙ

У першым чытанні дэпутацкім корпусам разгледжаны законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях аховы здароўя».

— Прайшло практычна два гады з таго часу, як мы працуем па абноўленым Законе «Аб ахове здароўя», у які мы ўносілі вялікую колькасць змяненняў, але жыццё настолькі дынамічнае, што наспела неабходнасць зноў уносіць змяненні, — адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Людміла МАКАРЫНА-КІБАК**. — Калі казаць пра аказанне медыцынскай дапамогі, што вельмі важна для людзей, якія пакутуюць, напрыклад, ад рэдкіх захворванняў (анкалагічныя, прыроджаныя), — гэта забеспячэнне іх лекавымі прэпаратамі. Прадугледжваецца магчымасць закупкі лекавых прэпаратаў для людзей з такімі паталогіямі, часам нават персанальна пад нейкага чалавека. Акрамя таго, не заўсёды ёсць магчымасць пры пэўнай цяжкай ці рэдкай паталогіі аказаць чалавеку медыцынскую дапамогу ў Рэспубліцы Беларусь. У прыведзеным законапраекце мы ўносім змяненні, каб такому чалавеку неабавязкова было выязджаць за межы краіны, а накіраваць біялагічны матэрыял для кансультавання за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ВАЕННАЙ СФЕРЫ

Таксама ў другім чытанні быў прыняты праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін», ратыфікаваны шэраг дакументаў. У прыватнасці, адобраны законапраект «Аб ратыфікацыі Пратакола паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб унясенні змяненняў у Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб сумесным забеспячэнні рэгіянальнай бяспекі ў ваеннай сферы ад 19 снежня 1997 года». Дэталізуюцца нормы Пагаднення аб рэгіянальнай групоўцы войскаў (сіл) Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі: прадугледжваецца магчымасць дыслакацыі злучэнняў і воінскіх часцей расійскай часткі гэтай групоўкі, аб'ектаў ваеннай інфраструктуры Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, якія забяспечваюць іх функцыянаванне.

Як падкрэсліў, прадстаўляючы дакумент, **міністр абароны Віктар ХРЭНІН**, на цяперашні момант тых мер, якія прымаюцца для забеспячэння бяспекі ваенным ведамствам сумесна з Расійскай Федэрацыяй, дастаткова. У сувязі з гэтым кіраўнік абароннага ведамства нагадаў аб падпісаным нядаўна разам з расійскім калегам Палажэнні аб парадку ўтрымання нестратэгічнай ядзернай зброі на тэрыторыі нашай краіны. «Гэта і ёсць тая дзейсная мера, якая павінна астудзіць агрэсіўны характар і ваяўнічую рыторыку, якая ідзе найперш ад нашых суседзяў, — адзначыў Віктар Хрэнін. — А тое, што ў інфармацыйным полі адбываецца, тут мы, вядома, будзем працаваць і далей».

Вераніка КАНЮТА.

ТЭХНАЛОГІІ, ШТО НАКОРМЯЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Памятаеце, як падчас «Белагра-2021» сацсеткі запоўнілі сэлфі з першым айчынным трактарам-беспілотнікам? Напэўна, інавацыйнымі дзівосамі «Белагра» пачастуе наведвальнікаў і на гэты раз.

— Выстава будзе размешчана на плошчы больш за 28 тысяч квадратных метраў, — расказаў **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Вадзім ШАГОЙКА**.

У рамках форуму пройдуць міжнародныя спецыялізаваныя выставы — у тым ліку «Белферма» і «Белпрадукт». **Адкрыецца выстава 6 чэрвеня і завершыцца — 11-га.** Айчынных аграрыяў, работнікаў харчовай і перапрацоўчай прамысловасці і іх замежных калег, а таксама гасцей «сельскагаспадарчай ВДНГ» яна збярэ ў выставачным цэнтры Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» (25 км ад Мінска і 6 км ад Нацыянальнага аэрапорта, дакладны адрас — пр. Пекінскі, 29).

НА ЛЮБЫ ГУСТ

Міжнародная спецыялізаваная выстава «Белагра-2023» сёлета будзе праводзіцца ўжо ў 33-і раз. Удзел у вядучым форуме аграрыяў возьмуць 450 кампаній з дзесяці краін свету. Акрамя гаспадыні мерапрыемства — Беларусі, гэта Расія, Кітай, Пакістан, Турцыя, Германія, В'етнам, Італія, Індыя і Палесціна. Для параўнання, летась у нашу краіну для ўдзелу ў «Белагра» прыехалі прадстаўнікі 425 кампаній з пяці краін. Таксама на «Белагра-2023» будуць прадстаўлены экспазіцыі 14 абласцей Расійскай Федэрацыі.

— Буйныя экспазіцыйныя блокі прадставяць Мінскі трактарны завод, «МАЗ», «Гомсельмаш», «Амкадор», Рэспубліканскае аб'яднанне «Белаграсэрвіс», «Бабруйскаграмаш», Мінскі маторны завод і шэраг іншых буйных кампаній, — адзначыў Вадзім Шагойка.

Ён дадаў, што больш за 90 % тэхнікі, якая выкарыстоўваецца на нашых палях, — айчыннай вытворчасці. На «Белагра» можна пераканацца, што па якасных і тэхнічных характарыстыках яна не саступае вядучым сусветным узорам.

Наведвальнікаў дакладна ўразіць «Белферма-2023». Там можна будзе ўбачыць абсталяванне для малочнатаварных фермаў, дзе за статкам сочыць і даглядае ўсяго некалькі аператараў, а практычна ўсе працэсы — аўтаматызаваныя. Прафесіяналам будзе цікава азнаёміцца з новымі кармамі і дабаўкамі, ветэрынарнымі прэпаратамі, праграмным забеспячэннем і біяэнергетычнымі тэхналогіямі. А калі вы вырашылі пабываць на выставе ўсёй сям'ёй, дзецям будзе даспадобы наведаць «Рыбацкую вёску» — яе арганізуе ДА «Белводгас».

Дванаццаццю прадпрыемствамі будзе прадстаўлена пладова-агароднінная прадукцыя, якая вырабляецца ў Рэспубліцы Беларусь, расказаў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання. Вялікая ўвага сёлета аддадзена тэме ўгнаенняў і сродкаў аховы раслін — яна будзе прадстаўлена чатырнаццаццю прадпрыемствамі, паведаміў ён.

Выстава «Белпрадукт» размесціцца на плошчы больш за 1200 м², удзел у ёй возьмуць 132 беларускія вытворцы з усіх рэгіёнаў краіны. Будзе арганізаваны кірмаш прадуктаў харчавання. «Кулінарны раздзел» аграрнага форуму па ўжо існуючай традыцыі прадугледжвае багацце і размах. Дэгустацыі на такіх выставах праходзяць паўсюдна, усё ўзорна-паказальна, смачна, духмяна і гасцінна — цалкам рэальна «надэгуставацца» да абсалютнай сытасці. Да таго ж у розных частках выставы будзе працаваць 11 пунктаў харчавання. Словам, ідэальнае месца, каб напоўніць халадзільнік і зведаць новыя смакі.

Дарэчы, на заметку дачнікам — на «Белагра» можна будзе набыць не толькі агародніну і садавіну, але і насенне новых сартоў і гібрыдаў ад айчынных селекцыянераў: усходжасць — гарантуецца. Атрымліваецца зручна: ацаніў канчатковы вынік — набыў насенне.

— Праграма «Белагра-2023» прадугледжвае як інтарэсы прафесіяналаў, якія прыязджаюць на выставу для заключэння кантрактаў і выбудоўвання бізнес-адносін, так і наведвальнікаў, якія могуць на свае вочы ўбачыць дасягненні сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай галіны і прыемна правесці час, — падкрэсліў Вадзім Шагойка.

Новы кірунак у праграме «Белагра» — спартыўны блок: лёгкаатлетычны забег і праграма Рэспубліканскага цэнтра коннага спорту з удзелам алімпійцаў.

ПЕРАГАВОРЫ І КАНФЕРЭНЦЫІ

Але ўсе вышэйпералічаныя атрыбуты свята разлічаны ў першую чаргу на тых наведвальнікаў, хто прыйшоў «проста паглядзець». Прафесіяналам падобныя форумы цікавыя ў зусім іншым ключы — у першую чаргу як пляцоўка для дзелавых сустрэч. У рамках «Белагра» прадугледжана каля двух дзясяткаў канферэнцый і семінараў, распавёў Вадзім Шагойка. Расклад кожнага дня прадугледжвае B2B-сустрэчы, дэманстрацыі і прэзентацыі, разлічаныя менавіта на прафесійны інтарэс.

— Ключавы момант ацэнкі міжнароднага супрацоўніцтва — тавараабарот і паступленне экспартнай выручкі, — адзначыў Вадзім Шагойка. — За мінулы год мы прыраслі па экспарце сельгаспрадукцыі, сельскагаспадарчай сыравіны і харчавання практычна на чвэрць. Сёлета тэндэнцыя захоўваецца: мы павялічваем экспартную выручку. «Белагра» — пляцоўка, якая спрыяе ўмацаванню сувязяў, заключэнню кантрактаў і канкрэтных дамоўленасцяў на доўгатэрміновую перспектыву.

Словам, на «Белагра-2023» цікава будзе ўсім катэгорыям наведвальнікаў. Застаецца толькі нагадаць, што выстава будзе працаваць з 6 да 11 чэрвеня ў парку «Вялікі камень» з 10 да 18.00. У гэтыя дні з Мінска ад станцыі метро «Магілёўская» будуць арганізаваны пастаянныя транспартныя зносіны.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

У ПАЛАЦЫ — «СКІФ» І «ДОБЛЕСЦЬ»

У Палацы Незалежнасці прайшла чарговая экскурсія. На гэты раз рэзідэнцыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь паказалі выхаванцам ваенна-патрыятычнага цэнтра спецыяльнай падрыхтоўкі «Скіф» і абласнога ваенна-патрыятычнага клуба «Доблесць» вайсковай часці 3310.

Да пачатку экскурсіі заставалася каля 15 хвілін. Хтосьці цярпліва чакаў пачатку мерапрыемства, хтосьці фатаграфаваў экспанаты ў зале ўрачыстых цырымоній. Увагу прыцягнуў малады чалавек у сінім берэце, які разглядаў карціны. Цімафею Афанасьеву 12 гадоў, ён родам з Рэчыцы. Там праходзіць падрыхтоўку ў ваенна-патрыятычным цэнтры «Скіф» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Грабава. У Мінску хлопчык бывае нячаста. Цімафея сапраўды вельмі ўразілі карціны, падараныя кіраўніку дзяржавы.

А вось Паліну Багушэвіч і Вячаслава Перцава з «Доблесці» ўразілі інтэр'еры Палаца Незалежнасці.

— Прадчувалі, што будзе нешта грандыёзнае, — гаворыць дзяўчына. — Вельмі прыгожа, усё бліжыць-зіхаціць.

— Як за гэтым усім сачыць — увогуле невядома, — жартуліва падтрымлівае гаворку хлопчык.

Таксама дзеці падзяліліся, што ім цікава паглядзець на абстаноўку, у якой працуе Прэзідэнт.

Іх кіраўнік старшы лейтэнант Іна Саскавец дадала, што выхаванцы «Доблесці» даўно хацелі сюды трапіць, паглядзець знутры на месца, дзе прымаюцца найважнейшыя рашэнні ў нашай краіне:

— Дзецям гэта вельмі цікава. Такое мерапрыемства можа паслужыць добрай матывацыяй для таго, каб у будучыні яны выбралі дастойную прафесію.

Экскурсія доўжылася каля дзвюх гадзін. За гэты час госці Палаца Незалежнасці змаглі наведаць розныя залы, якія бачылі да гэтага толькі па тэлевізары, зрабіць фатаграфію на тым месцы, дзе некалі засядала «нармандская чацвёрка», наведаць музей і даведацца шмат новага і цікавага пра гісторыю самога будынка.

Напрыклад, васьмігадовы Максім Някрасаў добра запомніў, што кожная зала мае сваю атмасферу, свой колер і што Палац Незалежнасці ўзводзіўся беларускімі будаўнікамі з беларускіх матэрыялаў. А больш за ўсё яго ўразіў музей, дзе, на думку хлопчыка, шмат цікавых экспанатаў.

А яшчэ многія дзеці задаваліся пытаннем, навошта шкляныя кабінкі ў некаторых залах. Аказалася, што яны прызначаны для камфортнай работы перакладчыкаў пры візіце замежных гасцей.

Усе засталіся пад уражаннем пасля праведзенай экскурсіі. Шмат экспанатаў, шмат карцін, шмат новай інфармацыі. Завяршылася мерапрыемства праглядам тэматычнага фільма.

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «Минскремстрой» Филиал «Сантехгазмонтаж», УНН 100302802; г. Минск, ул. Железнодорожная, 21а
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов – оборудование, бывшее в употреблении.
Местонахождение: г. Минск, ул. Железнодорожная, 21а

Лот, №	Наименование	Инв. №	Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб.
1	**Зигмашина С-237А**	65	**3 176,40**
2	**Зенковочный станок С-225**	129	**1 760,40**
3	**Резьбонарезной станок С-225**	707	**1 760,40**
4	**Ножницы НД 3318Г**	937	**2 696,40**
5	**Станок фальцепрокатный СТД-16**	1007	**2 696,40**
6	**Ножницы листовые Н 3121**	1050	**3 656,40**
7	**Резьбонарезной станок С-225**	1170	**1 760,40**
8	**Ножницы листовые НД 3318Г**	1433	**2 696,40**
9	**Механизм для резки труб СТД-21015**	1857	**1 760,40**
10	**Станок вертикально-сверлильный 2Н-118**	1188	**1 496,40**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после проведения торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены, регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 8 % по лоту № 6 и 10 % по остальным лотам от цены продажи предмета торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 04.07.2023 в 11.00. Окончание торгов: 04.07.2023 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 30.06.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора, директора ООО «Правовая Стратегия»
(220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404, п/я 34)
проводит повторный открытый аукцион по продаже оборудования КУП «Червенский деревообрабатывающий комбинат»
(223232, Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71)
в составе:

СТАНОК СВЕРЛИЛЬНО-ПРИСАДОЧНЫЙ МНОГОГОЛОВОЧНЫЙ Griggio G65/5T,

2013 г. в., инв. № 99-9, находится по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.

Начальная цена с НДС (20 %) – **2 988,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **298,00** бел. руб.
Начальная цена снижена на 70 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Работоспособность не проверялась, возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 30.07.2022, 24.09.2022, 10.11.2022, 09.12.2022, 21.01.2023.

Аукцион состоится **14.06.2023 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по**13.06.2023** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефоны для осмотра: (8029) 687-59-23, (8044) 717-02-56.

УНП 690308969

ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества **ООО «Юнайтед Стил-Ситинг»** (УНП 291479120), объявляет о проведении **14.06.2023 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

Унитарное предприятие

«Могилевское отделение БелТПП»

14 июня 2023 г. в 14.00

проводит торги по продаже следующих объектов.

ЛОТ № 1: КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА (инвестиционная площадка № 5) В СОСТАВЕ:

ПЕРЕЧЕНЬ 1 (Упаковка – 12 объектов)
ПЕРЕЧЕНЬ 2 (Транспортный – 38 объектов)
ПЕРЕЧЕНЬ 3 (Сырьевой – 11 объектов)
ПЕРЕЧЕНЬ 4 (Помол – 95 объектов)
ПЕРЕЧЕНЬ 5 (Обжиг – 125 объектов)
ПЕРЕЧЕНЬ 6 (Компрессорная – 23 объекта)
ПЕРЕЧЕНЬ 7 (Прочее – 7 объектов)

Перечень объектов и описания опубликованы в газете «Звязда» от 27.12.2022 г. и на сайте организатора торгов https://mogilev.cci.by

Начальная цена продажи лота № 1 снижена на 20 % с учетом НДС (20 %): 44 024 475,84 (сорок четыре миллиона двадцать четыре тысячи четыреста семьдесят пять белорусских рублей 84 копейки), задаток 4 402 447,58 бел. руб. (четыре миллиона четыреста две тысячи четыреста сорок семь белорусских рублей 58 копеек).

Собственник имущества: открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудски с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка», тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи +375224120914.

Организатор торгов: унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1. www.mogilev.cci.by

Место проведения торгов: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком.

Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.

Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся 14 июня 2023 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104.

Последний срок подачи заявления – 13 июня 2023 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов 14 июня 2023 с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778032, +375336070805 (А1) – Жилина Ольга Александровна.

Дополнительная информация размещена на сайте организатора.

Извещения о предыдущих торгах по объекту было размещено в газете «Звязда» от 22.12.2022 г.

УНП 700103211

ОАО «КЛИМОВИЧСКИЙ ЛИКЕРО-ВОДОЧНЫЙ ЗАВОД»
информирует о том, что 04.07.2023 года состоятся первые электронные торги по продаже имущества:

- Бутылка 0,7 винная в количестве 6165 (шт.);
- Бутылка В-500-тара 3 (0,5 л) в количестве 16148 (шт.);
- Бутылка стеклянная бесцветная 0,5 л XXL-B-28-1-500 в количестве 1083 (шт.)
- Бутылка LX-BM-2И-1000 (1,0 л) в количестве 21554 (шт.);
- Бутылка XXVII-B-32м-1750 (1,75 л) в количестве 7813 (шт.);
- Электросирена и оконечное устройство «Ответ», инвентарный номер 12393;
- Разделитель дистилятора V = 1,8 м³;
- Дефлегматор разгонный колонны F2;
- Холодильник пробный F- 0,25;
- Вакуумный прерыватель (12 шт.);
- Дефлегматор ректификационной колонны F80 м²;
- Подогреватель бражки F 80 м²;
- Лента транспортерная;
- Кипятильник F=3,5 м²;
- Куб бражной колонны 1400;
- Куб эпюрационной колонны 1200;
- Цилиндрическая вставка 1000 H=800 мм с горизонтальной перегородкой по середине;
- Царга кубовая, н/ж, 8-тарелочная;
- Царга сивушная (2 шт.);
- Царга рек. колонны (3 шт.);
- Конденсатор 10 м² н/ж (2 шт.).

С информацией об условиях проведения электронных торгов можно ознакомиться на сайтах: **torgi.gov.by и bankrot.gov.by.**

ПРА МАЛЕНЬКІЯ НОЖКІ

Днямі я спытала ў 4-гадовага сына, ад чаго, на яго погляд, бацькам трэба абараняць сваіх дзяцей. «Ад электрычнасці, ад стрэмак, ад вялікай колькасці цукерачак і мульцікаў, ад кляшчоў, ад дрэнных слоў, ад зубных монстраў...» Пра ўсё гэта, што ляжыць на паверхні, я пісаць не буду. Спынюся на менш відавочным, але, як мне здаецца, не менш важным.

У прыватнасці, я хачу абараніць сына ад страху памылак. Бо сама ў школьныя часы так баялася памыліцца, стараючыся адпавядаць чаканням бацькоў, што ў пагоні за вечнымі «пяцёркамі» не паспявала жыць. Колькі сябе памятаю — зубру, зубру, зубру. Таму цяпер стараюся прывіць свайму сыну разуменне, што памыляцца — гэта нармальна. І што адзнакі —далёка не самае галоўнае ў жыцці.

Яшчэ я цвёрда пераканана, што дзяцей трэба абараняць ад бацькоўскай гіперапекі. Калі ўсе жаданні малечы тут жа выконваюцца ці, што яшчэ горш, навязваюцца («Хочаш гэту цацку? Хочаш фіс-ташкавае марожанае? Хочаш яшчэ адзін мульцік?»). Не трэба дзяцей закормліваць, задарваць і ўвесь час забаўляць (не дай бог, мая крывіначка засумуе). Нічога добрага ў выніку не атрымаецца. Я згодна з псіхолагам Людмілай Петраноўскай, што няправільна і нават шкодна для дзіцяці імкнуцца зрабіць так, каб яно было заўсёды задаволеным і шчаслівым, ніколі не перажывала негатыўных эмоцый. «У жыцці ёсць месца фрустрацыі — сітуацыям, калі не ўсё ідзе так, як мы хочам. Задача бацькоў — дапамагаць напрацоўваць навыкі спраўляцца з ёй. За кошт гэтых навыкаў дарослы чалавек не будзе падаць на падлогу і рыдаць, таму што ў яго лопнуў шарык, як гэта робіць дзіця. Для дзіцяці гэта нармальна. Але хочацца, каб калі-небудзь і яно пачало па-іншаму спраўляцца з негатыўнымі эмоцыямі. Калі ж дзіця ніколі не будзе перажываць фрустрацыю, як яно навучыцца? Ніяк».

Яшчэ дзяцей вельмі важна змалку абараняць ад хлусні. А для гэтага самім трэба гаварыць толькі праўду. І ні ў якім разе не сварыцца, калі дзіця прыйшло і прызналася, што разбіла кубак, зламала цацку, атрымала дрэнную адзнаку, параніла-ся... Яно павінна разумець, што бацькі яго падтрымаюць у любой сітуацыі, што б ні здарылася. Бо «калі вам ваша дзіця хлусіць, гэта значыць, вы калісьці вельмі востра адрэагавалі на яго памылкі».

Яшчэ дзяцей трэба абараняць ад абыякавасці. Чытаць добрыя казкі. Заводзіць хатніх гадаванцаў. Хадзіць у паходы, наогул часцей быць на прыродзе, сустракаць світанкі і праважаць заходы сонца. Абарона пачынаецца з жадання знаходзіцца побач, цікавіцца жыццём і праблемамі дзіця, а не кідаць яго сам-насам з гаджэтамі. Прынамсі, я не разумею тых жанчын, якія прыводзяць сына з садка і даюць у рукі планшэт з мульцікам ці гульнёй — толькі б ён не замінаў. Ніякія цацкі, ежа, мульцікі не заменяць часу, праведзенага разам.

Але самае небяспечнае, што могуць учыніць бацькі дзіцяці, — зрабіць яго сэнсам свайго жыцця. Гэта непасільная ноша для любога чалавека. Таму што калі ты павінен апраўдваць сэнс чужога існавання, ты не можаш быць сабой — табе трэба адпавядаць. А адпавядаць сэнсу нерэальна. Вельмі складана. Нават невыносна. «Калі ласка, не перакладвайце такі груз адказнасці на дзяцей, яны не для таго прыйшлі ў гэты свет, — звяртаецца да бацькоў сямейны псіхолаг Карына Рыхтэрэ. — Знайдзіце для сябе іншыя сэнсы. А для тых, каго гэтыя словы раняць, простае практыкаванне. Уявіце, што вашы дзеці з'ехалі ад вас. Бо так і будзе (і чым мацней вы будзеце іх трымаць, тым хутчэй і далей яны з'едуць). Як сябе адчуваеце? Як будзеце жыць? Чым займацца? Калі адказы вам не падабаюцца — пачынайце дзейнічаць ужо цяпер».

Яшчэ мне хочацца абараніць сына ад уласных негатыўных эмоцый, накіраваных на яго. Хоць часам стрымацца вельмі няпроста: такое адчуванне, што дзеці створаны, каб выводзіць нас з сябе. Знаёмая неяк падзялілася цудоўным спосабам вяртання да міласэрнасці. Для гэтага ў момант нарастання гнеўных эмоцый трэба проста паглядзець на маленькія ножкі. Суаднесці ножкі дзіцяці са сваімі — па памеры, даўжыні. Гэта перамяшчэнне ўвагі робіць цуд: ужо не хочацца злавацца на сына, а толькі любіць і прымаць. Бо калі падумаць, то зусім няпроста быць маленькім, няпроста вучыцца жыць. Успомніце сябе ў дзяцінстве, свае ранейшыя страхі, засмучэнні, мары. І паспачувайце сваім сыночкам і дочкам. Таму што мы выраслі і сталі моцнымі. А яны пакуль цалкам залежаць ад нас. Давайце не будзем злоўжываць гэтай слабасцю і залежнасцю. Давайце памятаць, што не дзіця павінна нас разумець, а мы — дзіця. Хоць бы таму, што мы былі дзецьмі, а яны яшчэ не былі дарослымі. А для шчасця насамрэч дзецям патрэбна не так шмат. Псіхолагі спыталі ў 7-гадовага хлопчыка: «Што такое шчасце?» На што той адказаў: «Шчасце — гэта калі тата прыходзіць з працы і цалуе маму».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Сямейная газета

Выпуск № 10 (213)

Тыя, хто побач

Шчасце — на семярых

Са шматдзетнай сям'ёй Шамехіных пазнаёмілася летась на незвычайным свяце ў вёсцы Старая Беліца, што пад Гомелем. Шматлікія жыхары населенага пункта з песнямі і танцамі віншавалі Галіну Шамехіну з атрыманнем ордэна Маці. Каб падзяліць сваю радасць з аднавяскоўцамі, сям'я ў сваю чаргу падрыхтавала пачастункі, а ў сельскім клубе-бібліятэцы арганізавалі святочны канцэрт. Пасля выступлення, калі вялікае сямейства высыпала на вуліцу, каб сфатаграфавацца, падалося, што шэры кастрычніцкі дзень асвяціўся россыпам электрычных іскрынак. Такі пазітыўны зарад перадаваўся ад герояў свята. У гэтую сям'ю, дзе якраз «сем Я», карэспандэнт «Сямейнай газеты» завітала напярэдадні Дня абароны дзяцей.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Наша ўсё

ДЗЯЦІНСТВА — НАЙЛЕПШАЯ КРАІНА

Сёння мы адзначаем Міжнародны дзень абароны дзяцей. Яны складаюць пятую частку насельніцтва нашай краіны. Паводле даных Белстата, у Беларусі 1 827 758 дзяцей, прычым хлопчыкаў больш — 937,3 тысячы, дзяўчынак адпаведна 890,3 тысячы. Як лічаць спецыялісты, гэты дзень — нагода не толькі для свята і віншаванняў, але і магчымасць абазначыць вострыя пытанні, якія датычацца сем'яў, выхавання і працаўладкавання моладзі.

СВЯТА ЦЭЛЫ ДЗЕНЬ

Традыцыйна ў Беларусі ў Міжнародны дзень абароны дзяцей праводзіцца свята «Дзяцінства — мірная краіна», якое праходзіць у сталіцы. Сёння ў ім бярэ ўдзел каля 350 дзяцей з розных рэгіёнаў. Арганізатары прадугледзелі разнастайныя пляцоўкі і актыўнасці, у тым ліку дзве дыялогавыя пляцоўкі, дзе дзеці могуць задаць свае пытанні кампетэнтным дарослым, у прыватнасці, упаўнаважаным па правах дзіцяці.

Акрамя таго, сёння дзеці наведаюць Нацыянальны мастацкі музей і Нацыянальны гістарычны музей. Таксама на тэрыторыі Дзіцячага тэхнапарка і ў Рэспубліканскім цэнтры экалогіі і краязнаўства запланавана пасадка памятнай алеі з дрэў і клумбаў, прымеркаваная да Году міру і стваральнай працы.

Сталічная арганізацыя Беларускага саюза жанчын праводзіць сумесна з гандлёвым цэнтрам «Сталіца» інтэрактыўнае мерапрыемства з творчымі нумарамі і паказам мадэляў дзіцячага і падлеткавага адзення. Вялікае прадстаўленне пад назвай «Дзяцінства — гэта я і ты» падрыхтаваў Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі — з мноствам інтэрактыўных пляцовак і творчых лакацый. У сталічным адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Лідар» праходзіць свята «Мінскае лета — 2023», у якім бяруць удзел прадстаўнікі Чырвонага Крыжа і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Святочныя мерапрыемствы адбудуцца ў кожным раёне і горадзе, прычым не толькі ў дзіцячых парках, культурных установах і месцах адпачынку, але і ў дзіцячых дамах і дзіцячых бальніцах.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

Не прапусціце!

ВЯЛІКІ — МАЛЫМ

Сёння, у Міжнародны дзень абароны дзяцей, Вялікі тэатр Беларусі адчыняе дзверы для маленькіх і самых маленькіх гледачоў

Толькі ў гэты дзень можна апынуцца «На прыёме ў Караля», «У гасцях у Снежнай каралевы», на «Кірмашы казак», паспяваць разам з артыстамі вядомыя дзіцячыя песні, пачуць музычную казку Сяргея Пракоф'ева «Пеця і Воўк», разгадаць цікавыя музычныя загадкі, паўдзельнічаць у інтэрактыўных гульнях, здзейсніць «Падарожжа ў свет музыкі і казкі», акунуцца ў «Салодкае жыццё», пабываць у «Майстэрні мастака» і нават стварыць эскіз да спектакля.

А якое ж свята без сэлфі? Гасцей тэатра чакаюць маляўнічыя фотазоны з рэквізітам з дзіцячых спектакляў, а таксама гасціныя з казачнымі персанажамі. Можна пабываць на рэпетыцыях артыстаў, наведаць музычны і танцавальны майстар-класы. І ўсё гэта дазволена фатаграфаваць!

А яшчэ дзяцей і дарослых чакае шоу мыльных бурбалак, а шаноўную публіку пацешаць жанглёры і артысты на хадулях. Завершыцца святочная праграма на пляцоўцы каля галоўнага ўваходу — сваім майстэрствам здзівяць артысты тэатра вогненных і светлавых паказаў.



Кошт білетаў у гэты дзень сімвалічны: для непаўналетніх (да 18 гадоў) — 5 руб., для дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — бясплатна, для членаў шматдзетных сем'яў — 3 руб., для ўсіх астатніх — 7 руб. Білеты можна набыць у дзень свята ў касах тэатра. І майце на ўвазе, што праграма разлічана на пяць гадзін: пачатак у 14.00, завяршэнне ў 19.00.

Ксенія КАВАЛЕЎСКАЯ.

ДЗЯЦІНСТВА — НАЙЛЕПШАЯ КРАІНА

КОЛЬКАСЦЬ ІНТЭРНАТАЎ ЗНІЖАЕЦЦА

З 1996 года ў нашай краіне працуе Камісія па правах дзіцяці. Яе ўпаўнаважаныя штоквартальна праводзяць прыёмы. Сёлета такіх адбылося 62, у тым ліку 17 выязных. Як адзначыла **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена ВАЙЦЯХОВІЧ**, да ўпаўнаважаных камісіі звяртаюцца пераважна бацькі з прычыны спрэчак у выхаванні дзяцей.

— 1 чэрвеня — дзень, калі мы гаворым не толькі пра свята, але і пра тыя вострыя пытанні, якія датычацца абароны правоў дзяцей, — падкрэсліла Алена Вайцяховіч. — Больш за 19 тысяч дзяцей з дзевяці тысяч сем'яў знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Дзяржаўнымі органамі праводзіцца работа, накіраваная на тое, каб аказаць дапамогу гэтым сем'ям у пераадоленні складанай жыццёвай сітуацыі, каб дзеці засталіся з бацькамі.

Сёння ў Беларусі каля 15 тысяч дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Летась выяўлена 2 236 такіх дзяцей. Але гэты паказчык паступова зніжаецца — для параўнання, у пачатку 2010-х выяўлялася больш за чатыры тысячы такіх дзяцей штогод.

— Трэба адзначыць, што большая іх частка — не сіроты, а дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, — дадае Алена Вайцяховіч.

Такіх малых сёння ўсё часцей імкнуцца ўладкаваць у прыёмныя сем'і. Больш за 88 % з іх жыве ў замяшчальных сем'ях. Больш за сем тысяч усыноўлена і выхоўваецца ў сем'ях усынавіцеляў. Штогод на сямейныя формы выхавання ўладкоўваецца больш за 80 % дзяцей, якія засталіся без папячыцельства.

Колькасць дзіцячых інтэрнатных устаноў у краіне аптымізавана і працягвае скарачацца. У канцы 1990-х такіх устаноў у Беларусі было каля паўсотні, цяпер жа дзейнічае дзесяць дзіцячых дамоў і дзве школы-інтэрнаты для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Развіваюцца і такія формы пражывання, як дзіцячая вёска і дзіцячы гарадок — іх створана пяць.

Актыўна развіваюцца сямейныя формы ўладкавання. Сёння ў Беларусі функцыянуе 309 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу і 1505 прыёмных сем'яў. Найбольшая колькасць дзіцячых дамоў сямейнага тыпу ў Брэсцкай вобласці — 54, яшчэ два рыхтуюцца да адкрыцця. У Мінскай вобласці таксама актыўна развіваюцца дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, тут іх 43.

Шырока распаўсюджана і апека — пад ёй знаходзіцца больш за сем тысяч дзяцей. Як правіла, такая форма прадугледжвае, што блізкія сваякі прымаюць дзяцей у свае сем'і.

БЯСПЛАТНЫ ДЗЁННЫ ЛАГЕР

З 1 чэрвеня стартуе і дзіцячая аздараўленчая кампанія, у тым ліку ў дзённых лагерах. Як расказала **начальнік аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Ганна РЫСЯВЕЦ**, сёлета ў Мінску для малодшай узроставай групы 6–10 гадоў цалкам адменена бацькоўская даплата. Для сярэдняй і старэйшай узроставай груп яна мінімальная.

— Мінск традыцыйна з улікам прыцягнення сродкаў мясцовага бюджэту сур'ёзна падыходзіць да аздараўлення дзяцей-інвалідаў, — дадала спецыяліст. — Сёлета 93 дзіцяці з кардыялагічнай паталогіяй і 22 з цукровым дыябетам пройдуць аздараўленне ў комплексе «Ракета» ў суправаджэнні бацькоў. На працягу некалькіх гадоў на базе лагера «Юбілейны» ажыццяўляецца аздараўленне дашкольнікаў ад 3 да 5 гадоў. І сёлета 23 дзіцяці трапяць у гэты загарадны аздараўленчы лагер.

КАНФІДЭНЦЫЯЛЬНАСЦЬ ДЛЯ ПАДЛЕТКАЎ

У клопаце пра псіхічнае і фізічнае здароўе падлеткаў ключавую ролю адыгрываюць цэнтры, дружалюбныя падлеткам. Як расказала **намеснік дырэктара па педыятрыі РНПЦ «Маці і дзіця» Алена УЛЕЗКА**, у Беларусі дзейнічае 58 такіх цэнтраў. Сярод мэт іх дзейнасці — не толькі захаванне псіхічнага, рэпрадуктыўнага здароўя падлеткаў і іх саматычнага стану, але і фарміраванне імкнення да здаровага спосабу жыцця і сацыялізацыя ў грамадстве. Прынцыпы гэтых цэнтраў блізкія для ўсіх падлеткаў: даступнасць, дабравольнасць, давер, добразычлівасць і канфідэнцыяльнасць. Там праводзяцца як індывідуальныя, так і групавыя кансультацыі, магчымыя анлайн-кансультацыі і па тэлефоне. Пры неабходнасці супрацоўнікі цэнтраў накіроўваюць дзяцей да розных спецыялістаў. Летась у цэнтрах праведзена больш за 4,5 тысячы мерапрыемстваў з удзелам 150 тысяч маладых людзей.

ДАПАМОГІ І ВЫПЛАТЫ

Асноўным кампанентам падтрымкі сем'яў з дзецьмі з'яўляецца сістэма дзяржаўных дапамог, адзначае **галоўны спецыяліст упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Крысціна РАМАНОЎСКАЯ**. Імі ахоплена кожнае чацвёртае дзіця ў краіне, а дзеці да трох гадоў — на 100 %.

Асаблівым клопатам дзяржавы з'яўляюцца сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў (сёння іх у краіне амаль 38 тысяч). Найперш гэта шэраг выплат. Дзецям-інвалідам да 18 гадоў прызначаецца сацыяльная пенсія, памер якой дыферэнцаваны ў залежнасці ад ступені страты здароўя — ад 80 да 110 БПМ. Цяпер яе сума складае ад 282 да 387 рублёў.

Да трох гадоў дапамога па доглядзе такога дзіцяці прызначаецца ў павышаным памеры — 45 % ад сярэдняй зарплаты работніка ў краіне. Цяпер гэта 779 рублёў. На дзіця-інваліда, старэйшага за тры гады, штомесячна выплачваецца дапамога ў памеры 70 % БПМ, а калі ў сям'і ёсць і іншыя дзеці, старэйшыя за тры гады, то на кожнага з іх прызначаецца дапамога ў памеры 50 % БПМ. Існуе яшчэ адзін від дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда да 18 гадоў, яго памер устаноўлены ў залежнасці ад узросту і ступені страты здароўя — ад 100 % да 120 % БПМ. Акрамя таго, бацькам прапануюцца паслугі нянькі і сацыяльная перадышка.

Адна з сацыяльных гарантый — тэхнічныя сродкі рэабілітацыі. У цяперашні час з 59 найменняў 50 выдаюцца дзецям-інвалідам бясплатна. З іх 90 %, уключаючы каляскі розных тыпаў, трохколавыя веласіпеды, пратэзы, артэзы, артапедычны абутак, слыхавыя апараты, выдаюцца бясплатна і 10 % сродкаў рэабілітацыі выдзяляецца на ўмовах частковай аплаты (ад 10 да 50 % кошту). Ёсць шэраг іншых ільгот: бясплатнае забеспячэнне лекавымі сродкамі, бясплатны выраб зубных пратэзаў, бясплатнае санаторна-курортнае аздараўленне і лячэнне, бясплатны праезд на грамадскім транспарце.

АКТЫЎНЫЯ Ў ПОШУКУ РАБОТЫ

Працоўны кодэкс прадугледжвае магчымасць працаўладкавання з 16 гадоў, а пры пісьмовай згодзе аднаго з бацькоў — з 14-ці, нагадвае Крысціна Раманоўская. Вызначаны і пералік работ, якія могуць выконваць падлеткі з 14 гадоў. Пры гэтым моладзь мае права рэгістравацца ў якасці беспрацоўных з 16 гадоў.

— Сур'ёзнай перавагай моладзі на рынку працы з'яўляецца бясплатная магчымасць атрымання вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Пры гэтым дзяржава гарантуе выпускнікам дзяржаўных навучальных устаноў пры ўмове навучання за кошт бюджэту першае працоўнае месца шляхам размеркавання, — звяртае ўвагу спецыяліст.

З агульнай колькасці выпускнікоў устаноў прафесійнай адукацыі ў якасці беспрацоўных летась звярнулася ў службы занятасці па садзейнічанне ў працаўладкаванні больш за паўтысячы, з іх 179 — выпускнікі з вышэйшай адукацыяй, 326 чалавек з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, 29 — з прафесійна-тэхнічнай. Працаўладкавана 465 чалавек — 87 % ад усіх, хто звярнуўся.

— Маладзёжны рынак працы ў нашай краіне характарызуецца невысокім узроўнем беспрацоўя сярод насельніцтва ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў. У лютым 2023 года, паводле даных выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак, ён склаў 6,3 %. Год таму гэты паказчык быў 7,1 %, — расказвае Крысціна Раманоўская.

Асноўнымі напрамкамі работы з моладдзю на рынку працы, па-першае, з'яўляецца браніраванне працоўных месцаў для тых, хто ўпершыню шукае работу ва ўзросце да 21 года. У 2022 годзе працаўладкавана 9,1 тысячы беспрацоўнай моладзі ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў, у тым ліку 702 чалавекі, якія ўпершыню шукалі работу ва ўзросце да 21 года, а таксама 272 чалавекі — за кошт броні.

Па-другое, ажыццяўляецца працаўладкаванне для атрымання практычнага вопыту работы па атрыманай прафесіі на часовыя працоўныя месцы. Наймальнікам, якія выдзяляюць такія працоўныя месцы, часткова кампенсуюцца затраты на аплату іх працы. Летась 342 беспрацоўным ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў аказана садзейнічанне для атрымання практычнага вопыту.

Па-трэцяе, гэта арганізацыя прафесійнага навучання. Яно праводзіцца па прафесіях, запатрабаваных на рынку працы. У цяперашні час яно ажыццяўляецца больш чым па 100 прафесіях, у тым ліку можна прайсці курс навучання асновам прадпрымальніцкай дзейнасці. Летась на навучанне накіраваны 951 беспрацоўны з ліку моладзі, а гэта 28 % ад накіраваных на навучанне.

Па-чацвёртае, арганізоўваецца часовая працоўная занятасць моладзі ў вольны ад вучобы час. Штогод колькасць працаўладкаванай моладзі павялічваецца. Летась з фінансавай падтрымкай дзяржавы аказана садзейнічанне ў працаўладкаванні на часовыя працоўныя месцы 38 тысячам навучэнцаў. Сёлета за чатыры месяцы працаўладкавана ўжо амаль шэсць тысяч маладых людзей.

— Маладыя людзі актыўныя ў пошуку работы, — падкрэслівае Крысціна Раманоўская. — Рэспубліканскі кірмаш вакансій, які праходзіў сёлета з 15 да 19 мая, наведала больш за 28 тысяч маладых людзей. З іх дамовіліся з наймальнікамі 10,7 тысячы, у тым ліку 7,2 тысячы непаўналетніх. Усяго 2,3 тысячы наймальнікаў прапанавалі 30 тысяч вакансій.

Алена КРАВЕЦ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Шчасце — на семярых

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Дома, у рытме звычайным, побытавым, Шамехіны аказаліся такімі ж няўрымслівымі і вельмі адкрытымі. Дужыя, дружныя, дзейсныя... Глядзіш і ганарышся: з якімі сем'ямі разам жывеш у адной краіне.

У Галіны і Сяргея Шамехіных — чатыры дачкі і сынок. Старэйшай Лізе — 19 гадоў. Яна скончыла педагагічны каледж, працуе ў школе настаўнікам пачатковых класаў, паралельна вучыцца ў Гомельскім дзяржуніверсітэце, а яшчэ ўзначальвае маладзёжнае крыло Урыцкай пярвічнай арганізацыі «Беларускага саюза жанчын». Сярэдням — Маргарыце і Сафіі — 13 і 8 гадоў, малодшым — Ангеліне — 5 гадоў, а Цімафею — два.

Сама шматдзетная мама Галіна — адна з шасцярых дзяцей сваіх бацькоў. У сям'і Сяргея Шамехіна расло трое хлопцаў. Даведваюся, што ўвогуле ў шматдзетных бацькоў і ўжо ў іх бацькоў, родных сясцёр і братоў на ўсіх — 36 дзяцей. У старэйшага пакалення — без малога два дзясяткі ўнукаў.

— Мы з мужам хадзілі ў адзін дзіцячы садок, потым у школу. У наступным месяцы адзначым роўна 20 гадоў, як ажаніліся, — дзеліцца Галіна.

За гэты час яны сваімі сіламі пабудавалі дом у роднай вёсцы. Калі нарадзілася трэцяя дзіця, завялі хатняю гаспадарку. Пачалі апрацоўваць вялікі агарод, а цяпер нават і не адзін, гадаваць свінак, козачак, курэй.

— Наогул, даводзілася чуць ад людзей у нашай вёсцы, як ім мяне шкада. Кажуць, бедная ты, Галка, з пяці раніцы ўжо на нагах. Я здзіўляюся і заўсёды гавару: шкадуеце, бо не ведаеце, якая я шчаслівая. Я заўсёды марыла, каб у мяне была вялікая сям'я, — усміхаецца жанчына.

Галіна, наперакор чужому ўяўленню, даказвае сваім прыкладам, што шматдзетная мама можа ўдала спраўляцца і з гадаваннем дзяцей, і вядзеннем вялікай гаспадаркі.

— Дачушка Сафія заканчвае трэці клас — яна наша з мужам вялікая памочніца па гаспадарцы. Старэйшыя дочкі — Ліза і Маргарыта — могуць цалкам замяніць мяне ў прыборцы дома, гатаванні, дапамагаюць агарод палоць. Але на зямлі, дарэчы, работу не так любяць, — смяецца Галіна, а малодшыя дочкі тут жа хочуць пахваліцца, як умеюць паіць коз, свінак, курэй і куранят. Дапамагаюць карміць жыўнасць.

Уключаюцца ў насычанае працай жыццё сям'і і самыя маленькія — Ангелінка і Цімоша. Дапамагаюць як могуць: слухаюцца, не капрызяць, актыўна цікавяцца тым, як працуюць па гаспадарцы старэйшыя.

Цікава, што Шамехіны — сям'я тэхнічная. Яны фанаты самай рознай сучаснай тэхнікі. У доме, акрамя звыклых побытавых гаджэтаў, — пасудамыйка, робат-пыласос, адпарвальная станцыя і нават калонка-ўзмацняльнік для караоке. Больш, чым тэхнікі для дома, у іх розных гаджэтаў для вядзення гаспадаркі.

— Нашы дзеці заўжды бачаць, як мы разам з мужам ахвотна «прыручаем» розную тэхніку. Напрыклад, у нас два міні-тракторы з прычэпамі. Кіруе не толькі муж, але і я. Разам едзем траву ці сена нарыхтоўваць, — тлумачыць Галіна, якая навучылася вельмі добра абыходзіцца і з мотаблокам, і з культыватарам. — У нас шмат самых розных агрэгатаў для касьбы, апрацоўкі зямлі.

Дзякуючы сваёй працавітасці і надзвычайнай дружнасці Шамехіны — знакамітасці Старой Беліцы. Бацьку вялікага сямейства ўдаецца сумяшчаць догляд дамашняй гаспадаркі з асноўнай працай на Гомельскім хімічным заводзе.

— Нас у вёсцы называюць неразлучнікамі. Мы з мужам усё робім разам, а дзеці глядзяць і бяруць прыклад з нас, — раскрывае Галіна сакрэт сваёй сям'і . — Увогуле, пра наш род сапраўды кнігу напісаць можна ці фільм зняць. І галоўная дзеючая сіла там была б — дзеці, — пераканана шматдзетная мама.

Галіна Шамехіна — першая і пакуль адзіная маладая жанчына ў іх вёсцы, якая адзначана дзяржаўнай узнагародай — ордэнам Маці.

— Мая мама Ніна Васілеўна Балбушава была ўзнагароджана ордэнам Маці ў 1999 годзе, а мая залоўка, Аксана Балбушава, у якой шасцёра дзяцей, — амаль дзесяць гадоў таму. Для мяне гонар, што і я як шматдзетная мама атрымала дзяржузнагароду, — зазначае Галіна і прызнаецца, што, калі на вясковым свяце яе віншавалі з гэтай падзеяй, плакала і не магла ўтрымацца.

— Ад свайго мацярынскага шчасця плакала, бо, дзякуй богу, у мяне вельмі добрая сям'я. Я, калі лёс паспрыяе, мару стаць мамай і шосты раз, — прызнаецца жанчына.

Увогуле, муж і жонка Шамехіны пераконваюць, наколькі важна, а ў вёсцы асабліва, імкнуцца забяспечыць дзяцей не толькі ў бытавым плане, але і даць магчымасць развівацца творча.

У Старой Беліцы працуюць дзіцячы садок і пачатковая школа. Старэйшыя дзеці з пятага класа мусяць ездзіць вучыцца ў цэнтр сельсавета — Урыцкае. У гуртках па інтарэсах яны займаюцца пры школе або ў клубе-бібліятэцы ў самой Старой Беліцы.

— Мы з мужам і старэйшая дачка Ліза водзім машыну. Стараемся быць максімальна мабільнымі. Але ўсё ж вазіць дадаткова дзяцей на гурткі ў горад праблематычна для нас. Праўда, мы не здаёмся: вечарамі з дзецьмі шмат што робім рукамі — лепім, малюем. Цяпер у нас новае сямейнае захапленне — спяваем пад караоке, танцуем, здымаем кліпы для сябе. Нядаўна самі знялі і змантіравалі кліп аб сваёй сям'і для ўдзелу ў абласным конкурсе, — дадае Галіна.

Неверагодна, але такое імкненне карысна заняць, творча развіваць дзяцей маладая маці сумяшчае з дамашняй кулінарнай вытворчасцю, інакш не скажаш. Яна мінімізавала пакупкі прадуктаў у краме. Вырабляе сама ўсю неабходную «малочку» — ад тварагу да сыроў, усю выпечку, робіць дамашнія вырабы з мяса. Але пераканана, што без падтрымкі мужа і дзяцей ні з чым бы не справілася.

— Я смяюся і кажу, што ў нас не пяцёра дзяцей, а плюс яшчэ амаль 30, бо старэйшая дачка Ліза — настаўніца пачатковых класаў. Сшыткі, заданні, клопаты і праблемы вучняў — яна перажывае, і мы, вядома, таксама разам з ёй. Таму ў нас увогуле ўсё навокал пра дзяцей і для дзяцей.

Цікава было дазнацца ў маладога педагога Лізаветы Сяргееўны Шамехінай: тое, што яна — старэйшая сястра ў шматдзетнай сям'і, дапамагае ў працы ў школе?

— Не тое слова! І калі прыйшла працаваць, першымі гэта — не ведаю, як — адчулі дзеці. Мне лягчэй кантраляваць клас, мірыць тых, хто пасварыўся, адчуць, да каго які падыход абраць, — падзялілася Лізавета Шамехіна. — Калі маме ўручылі ордэн Маці, увесь калектыў школы шчыра мяне віншаваў. Калегі дзівіліся, якія ў мяне прыгожыя, маладыя, паспяховыя бацькі. Дарэчы, у працы з дзецьмі вельмі дапамагло тое, што з маленства мама з татам падтрымлівалі мяне і шчыра захапляліся маімі творчымі заданнямі для школы. Вырабы для конкурсаў рыхтавалі разам і ўсім было цікава. Я цяпер так са сваімі вучнямі працую.

Дарэчы, усе малодшыя сёстры Шамехіны таксама актыўныя ўдзельнікі вясковага грамадскага жыцця. Яны спяваюць, чытаюць вершы на ўсіх мерапрыемствах і акцыях, што праводзяцца ў роднай вёсцы. Разам з бацькамі дзеці ўдзельнічаюць ў спартыўных святах.

Днямі сям'я са Старой Беліцы ўпершыню прымала ўдзел у абласным конкурсе сямейнай творчасці «Жывіце ў радасці», які праходзіў у Рэчыцы. Для ўдзелу ў свяце неабходна было прадставіць мастацкія і кулінарныя шэдэўры, а таксама канцэртнае выступленне.

— На падрыхтоўку да конкурсу ў нас пайшло амаль тры месяцы. Дапамагала на ўсіх этапах і ідэйна натхняла нас загадчыца Старабеліцкага сельскага клуба-бібліятэкі Ларыса Грыгарэнка, — шчыра дзякуе Галіна.

Чайна-бліннае раздолле, бульбяны рай, малочны букет, мясны сусвет... Гэта толькі частка назваў, пад якімі ўдзельнікі са Старой Беліцы прэзентавалі прыгатаваныя ў канцы нумара выйшлі на сцэну муж са старэйшымі дочкамі і мае бацькі.

У «групе падтрымкі» засталася мама Сяргея — Раіса Канстанцінаўна з малодшым Шамехіным, бо сынок Цімафей трымаўся-трымаўся ды заснуў, не паглядзеўшы выступленне. «Давядзецца больш актыўна ўдзельнічаць у конкурсах надалей, каб і ён прывыкаў да сцэны», — смяецца шматдзетная мама.

Галіна раіць усім бацькам выязджаць з дзецьмі на падобныя фестывалі, дзе можна дзяліцца вопытам і сямейнымі традыцыямі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

Спецыяльна для «СГ»

Рэцэпт любімага фірменнага торта сямейства Шамехіных

Для бісквіту: *3 яйкі, 100 г цукру, 100 г мукі, соль (для вялікай сям'і прадуктаў можна ўзяць двайную норму).*

Міксерам узбіць яйкі з цукрам, які ўсыпаецца часткамі. Маса павінна павялічыцца ў аб'ёме не менш чым удвая. Затым міксерам (на слабых абаротах) ці лепш сіліконавай лапаткай умешваць муку, якая прасейваецца праз сіта. Адным каржом выпякаць бісквіт каля 40 хвілін. Як будзе гатовы, астудзіць і разрэзаць на тры каржы.

Для крэму: *паўлітра малака, тры сталовыя лыжкі цукру і столькі ж, але лыжкі з горкай, крухмалу, 100 г сметанковага масла.*

Сумесь малака з цукрам і крухмалам паставіць на маленькі агонь. Памешваць, варыць, пакуль крэм не стане як густая смятана. Пасля дадаць у масу сметанковае масла. Важна: крэм накрыць харчовай плёнкай так, каб яна прыціснулася да паверхні крэму. Даць яму цалкам астыць.

Для прамочвання бісквітных каржоў: *разведзенае 1:1 з вадой згушчанае малако, кава (апошні варыянт больш падабаецца дарослым, але не дзецям).*

На прамочаныя каржы выкладваецца крэм, на які (будзе вельмі смачна) пакласці кружкі банана.

Крэатыў

Фільтруй кантэнт!

VI фестываль медыяцыі для школьнікаў і студэнтаў прайшоў пад Мінскам

Узаемаразуменне, пазітыўная камунікацыя і максімальна выгаднае для ўсіх вырашэнне канфліктных сітуацый — гэта далёка не ўсё, чаму можна навучыцца з дапамогай медыяцыі, упэўнены арганізатар фестывалю — Цэнтр «Медыяцыя і права». Сёлета галоўнай тэмай мерапрыемства, якое прайшло ў дзіцячым лагеры пад Ждановічамі, сталі «Канфлікты ў сеціве і магчымасці медыяцыі ў іх вырашэнні».

Падчас двухдзённага мерапрыемства маладыя людзі слухалі лекцыі і ўдзельнічалі ў брыфінгу «Медыяцыя ў школе. Як яна працуе» (экспертамі тут, дарэчы, выступалі юныя медыятары, у школах якіх ужо створаны адпаведныя службы. Наведалі навукова-практычную канферэнцыю школьнікаў, студэнтаў і маладых вучоных «Медыяцыя як альтэрнатыўны спосаб бяспекі ў інтэрнэце», па выніках якой будзе выдадзены зборнік тэзісаў і дакладаў для электроннай бібліятэкі БДЭУ. Крэатывілі ў Майстэрні коміксаў, малюючы правілы паводзін у сеціве. На сабе апрабавалі такую тэхніку медыяцыі, як «кругі згуртавання», якая прымяняецца, калі ў канфлікце задзейнічана шмат людзей.

Медыятары гаварылі з падлеткамі пра значнасць медыяцыі ў крымінальным канфлікце, аб прымірэнні, раскаянні, прабачэнні. Дапамагалі моладзі паглядзець на медыяцыю як на рэсурс і для даравання (без чаго немагчыма цалкам вылечыцца ад траўмы, якую крыўдзіцель нанёс пацярпеламу), і для раскаяння і прыняцця адказнасці за здзейсненае.

Паводле задумкі арганізатараў, моладзь павінна разумець пад медыяцыяй не толькі магчымасць вырашыць канфлікт і памірыцца, але і разабрацца ў сабе і сваіх пачуццях. Удзельнікі фестывалю даведаліся, як фільтраваць кантэнт, каб ён быў бяспечны, як не паддавацца на правакацыю ў сеціве, як рэагаваць на кібербулінг і шмат што іншае.

Падрабязней пра асаблівасці медыяцыі і тое, што адбывалася на фестывалі, мы абавязкова раскажам у адным з нумароў «СГ».

Ірына СІДАРОК.

З КІМ ЗАСТАНЕЦЦА ДЗІЦЯ?

Двое разышліся, пытанні пачаліся...

Скасаванне шлюбу цягне за сабой нямала складаных і неадназначных пытанняў. І, напэўна, самае балючае з іх — з кім будуць пражываць непаўналетнія дзеці пасля таго, як бацькі развядуцца. Аб тым, што кажа пра гэта закон і на чыім баку будзе суд, мы спыталі ў адваката Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алены ГРОНСКАЙ.

Існуе меркаванне, што дзіця пасля разводу павінна пражываць з маці. Часцей за ўсё на практыцы так і здараецца. Але бываюць і іншыя сітуацыі. Калі бацька клапатлівы і любіць дзяцей, а маці вядзе асацыяльны лад жыцця і ўласнымі дзецьмі не цікавіцца — зразумела, дзеці будуць перададзеныя на выхаванне бацьку. Не зможа суд, згодна з законам, пакінуць непаўналетніх з тым з бацькоў, хто злоўжывае алкаголем або наркатычнымі рэчывамі, мае псіхічныя захворванні і з прычыны вышэйназванага не здольны забяспечыць належныя ўмовы для росту і развіцця юнага чалавека. У гэтым выпадку дзіця можа быць перададзена па рашэнні суда другому з бацькоў.

Дамовіцца — лепш

Юрысты адзначаюць, што ёсць пытанні, пра якія былым сужэнцам варта дамовіцца яшчэ да заканчэння шлюбаразводнага працэсу. Першае і галоўнае якраз датычыцца месца пражывання дзяцей пасля разводу: з кім з бацькоў яны застануцца. Другое — правоў на ўдзел у выхаванні дзяцей таго з бацькоў, хто пражывае асобна. І, нарэшце, пытанне спагнання аліментаў: парадак і памер аліментаў рэкамендуецца абмеркаваць паміж сабой у спакойнай абстаноўцы, а не ў судовым парадку.

Бацькі маюць права заключыць Пагадненне аб дзецях або ўрэгуляваць пытанні выхавання дзяцей у Шлюбным дагаворы (найбольш рацыянальны і цывілізаваны шлях).

— Практычна ўсе пытанні пра дзяцей бацькі могуць вырашыць мірным шляхам, без звароту ў суд, — кажа адвакат Алена Гронская.

Але магчыма вырашэнне пытання пражывання дзяцей і ўдзелу ў выхаванні таго з бацькоў, хто пражывае асобна, у судовым парадку.

— Бацькі, якія пражываюць асобна, маюць права па ўзаемнай згодзе вызначыць месца жыхарства непаўналетняга дзіцяці (дзяцей), — тлумачыць адвакат. — У выпадку недасягнення згоды па пытанні месца жыхарства дзіцяці кожны з бацькоў мае права звярнуцца ў суд з іскам «Аб вызначэнні месца жыхарства дзіцяці».

Правы — роўныя

Заканадаўствам Рэспублікі Беларусь прадугледжана роўнасць правоў і абавязкаў бацькоў у дачыненні да сваіх дзяцей. Правы дзіцяці і падставы іх узнікнення, прыярытэт правоў і законных інтарэсаў дзіцяці замацаваны Канстытуцыяй, Законам аб правах дзіцяці і нормамі Кодэкса аб шлюбе і сям'і.

— Права дзяцей на клопат і ўвагу з боку маці і бацькі з'яўляецца роўным незалежна ад сумеснага або паасобнага пражывання бацькоў — гэтая норма замацавана ў ч. 2 арт. 185 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, — падкрэслівае адвакат. — Бацькі карыстаюцца роўнымі правамі і нясуць роўныя абавязкі ў дачыненні да сваіх дзяцей і ў выпадку скасавання шлюбу паміж імі, калі іншае не прадугледжана ў Пагадненні аб дзецях, — дадае Алена Гронская.

«Улік меркавання дзіцяці, якое дасягнула 10 гадоў, абавязковы пры вынясенні рашэння па спрэчцы аб вызначэнні месца жыхарства непаўналетняга».

Варта адзначыць, што калі бацькі пражываюць хоць і адасоблена, але па адным адрасе, спрэчка аб месцы жыхарства дзіцяці не ўзнікае, падкрэслівае адвакат. У такіх выпадках магчымыя спрэчкі — аб парадку ўдзелу бацькоў у выхаванні дзіцяці. Па спрэчках, звязаных з выхаваннем дзяцей, удзел у справе (судовым разглядзе) органа апекі і папячыцельства з'яўляецца абавязковым. Ён можа выступаць як дзяржаўны орган, упаўнаважаны даць заключэнне па справе.

— Заключэнне органа апекі і папячыцельства складаецца ў выглядзе асобнага дакумента на падставе актаў абследавання і павінна ўяўляць сабой падрабязны аналіз усіх абставін, якія датычацца ўмоў жыцця дзіцяці і яго ўзаемаадносін з асобамі, якія прэтэндуюць на яго выхаванне, і ўтрымліваць выснову па сутнасці спрэчкі. Заключэнне падпісваецца ўпаўнаважанай службовай асобай упраўлення (аддзела) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта і мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе. Нязгода з заключэннем органа апекі і папячыцельства павінна быць выкладзена ў матывацыйнай частцы рашэння ў выпадку яе складання.

Вырашаючы спрэчку аб месцы жыхарства дзіцяці пры асобным (па розных адрасах) пражыванні бацькоў (незалежна ад таго, ці знаходзяцца яны ў шлюбе), суд прымае пад увагу мноства абставін, адзначае адвакат.

— Гэта ўзрост дзіцяці, яго прыхільнасць да кожнага з бацькоў, братоў, сясцёр, іншых членаў сям'і, маральныя і іншыя якасці бацькоў, адносіны, якія склаліся паміж кожным з бацькоў і дзіцем, ступень клопату і ўвагі, якія праяўляюцца да дзіцяці з боку бацькоў з улікам іх роду дзейнасці, рэжыму працы, іншых умоў жыцця, магчымасць забеспячэння кожным з іх належных матэрыяльна-бытавых умоў для выхавання і развіцця дзіцяці, а таксама іншыя абставіны, якія склаліся ў месцы пражывання кожнага з бацькоў.

Суд улічвае таксама магчымасць стварэння належнай маральна-псіхалагічнай атмасферы вакол юнага чалавека. Дарэчы, перавага ў матэрыяльна-бытавым становішчы аднаго з бацькоў сама па сабе не з'яўляецца безумоўнай падставай для перадачы яму дзіцяці на выхаванне.

Самы важны голас

Заканадаўства зыходзіць са статусу дзіцяці як самастойнага суб'екта праваадносін. І ўлік меркавання дзіцяці, якое дасягнула 10 гадоў, абавязковы пры вынясенні рашэння па спрэчцы аб вызначэнні месца жыхарства непаўналетняга, падкрэслівае Алена Гронская.

— Пункт 11 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 30 верасня 2004 г. № 11 «Аб практыцы разгляду судамі спрэчак, звязаных з выхаваннем дзяцей» абвяшчае: судам належыць мець на ўвазе, што дзіця, якое дасягнула дзесяці гадоў, мае права само выбраць, з кім з бацькоў яно будзе пражываць.

Але ёсць выключэнне: калі жаданне дзіцяці пражываць з адным з бацькоў супярэчыць яго інтарэсам. Бо далёка не заўсёды юны чалавек можа ацаніць падзеі і іх наступствы ў перспектыве.

— Меркаванне дзіцяці і прадстаўленая яму магчымасць асабістага ўдзелу ва ўстаноўленых законам выпадках і формах пры ажыццяўленні судовага разбору маюць асаблівую значнасць для законнага і абгрунтаванага вырашэння спрэчкі аб вызначэнні месца жыхарства, — падкрэслівае адвакат. — Дзеці маюць права на асаблівы, пераважны і першачарговы клопат як з боку бацькоў, так і з боку дзяржавы, які неабходны для іх дабрабыту і гарманічнага развіцця. Таму пры разглядзе спрэчак, звязаных з выхаваннем непаўналетніх, суды выносяць рашэнні ў мэтах максімальнай абароны правоў і інтарэсаў дзяцей, стварэння ім найлепшых умоў для росту і развіцця.

Дзіця, што дасягнула 14 гадоў, можа звярнуцца ў суд самастойна, калі, напрыклад, адзін з бацькоў перашкаджае яго зносінам з іншым.

Вырашаючы спрэчку, звязаную з месцам жыхарства дзіцяці, суд мае права разгледзець і патрабаванні аб спагнанні аліментаў.

— Трэба ўлічваць, што праваадносіны паміж бацькамі па пытаннях, звязаных з выхаваннем дзяцей, з'яўляюцца доўгатэрміновымі, таму наяўнасць рашэння суда не з'яўляецца перашкодай для ўзбуджэння новай справы паміж тымі ж бакамі і аб тым жа прадмеце, калі змяніліся абставіны, на якіх заснавана рашэнне.

Меркаванне дзіцяці аб тым, з кім з бацькоў яно хоча пражываць, па запыце суда выяўляецца органам апекі і папячыцельства па месцы жыхарства дзіцяці.

— У адпаведнасці з падпунктам 8-2.5. п. 8 Палажэння аб органах апекі і папячыцельства, меркаванне дзіцяці па запыце суда па ўсіх спрэчках, якія закранаюць яго правы і законныя інтарэсы, даручаецца выяўляць сацыяльна-педагагічным цэнтрам. Жаданне дзіцяці аб тым, з кім з бацькоў ён будзе пражываць, пры неабходнасці можа быць таксама высветлена і судом як у працэсе падрыхтоўкі справы да судовага разбору, так і ў ходзе судовага пасяджэння шляхам асабістай гутаркі ў прысутнасці педагога. Пры гэтым вызначаецца, ці з'яўляецца жаданне дзіцяці шчырым, да каго з бацькоў яно больш прывязана, ці не аказвалася на яго ўздзеянне з боку аднаго з бацькоў або іншых асоб (дзеда, бабулі, старэйшых братоў і сясцёр, іншых сваякоў і зацікаўленых асоб) і г. д. Даведка аб выніках гутаркі складаецца суддзёй і далучаецца да матэрыялаў справы.

І яшчэ адзін нюанс: у адпаведнасці з законам, дзіця, што дасягнула 14 гадоў, можа звярнуцца ў суд самастойна, калі, напрыклад, адзін з бацькоў перашкаджае яго зносінам з іншым, ужываючы сілавыя метады ўздзеяння на непаўналетняга.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ШТО КАЖУЦЬ ПСІХОЛАГІ

Тут можа ўзнікнуць пытанне: чаму дзіця ўдзельнічае ў прыняцці рашэння, з кім пражываць, толькі калі яму 10 і больш гадоў? А калі яно маладзейшае, яго ўплыў на гэтае пытанне — толькі апасродкаваны і не настолькі значны? Дзіцячыя псіхолагі адзначаюць, што чым меншыя дзеці, тым больш яны схільныя да эмацыянальных і спантанных рашэнняў. Практыка паказвае, што з прычыны яшчэ неакрэплай псіхікі малыя здольныя мяняць сваё меркаванне па некалькі разоў на дзень, а само па сабе прыняцце канчатковага рашэння становіцца для іх моцным стрэсам. Закон жа імкнецца абараніць правы дзіцяці — часам нават ад яго самога. Таму тое, што кажа малы, важна ацэньваць рацыянальна. Тым больш што да 10 гадоў дзеці схільныя «адлюстроўваць» значных дарослых — у першую чаргу бацькоў. Калі мама негатыўна і эмацыянальна выказваецца пра тату, то і дзіця ўстане на такую пазіцыю. А сустрэўшыся з татам і заўважыўшы, што негатыўныя выказванні пра маму радуюць бацьку, дзіця мяняе свае выказванні на дыяметральна супрацьлеглыя. У гэтай сітуацыі бацькам важна ўстрымацца ад рэзкіх заўваг і крытыкі ў дачыненні да былой «другой паловы» ў прысутнасці дзяцей і, вядома, спецыяльна не настройваць непаўналетніх супраць бацькі або маці. Важна разумець, што гэта ўзмацняе стрэс дзіцяці і негатыўна ўплывае на яго псіхалагічны стан, самаацэнку і далейшае развіццё. У канчатковым выніку ў бацькоў і заканадаўцаў адна мэта: абараніць юнага чалавека, які апынуўся ў няпростай жыццёвай сітуацыі. Бо калі разбураецца сям'я, яе абломкі балюча раняць не толькі дваіх, якія вырашылі разысціся, але і ў першую чаргу іх агульных дзяцей.

НАРАДЖАЦЬ НЕ ШКОДНА!

Плюсы і мінусы цяжарнасці пасля 35

Сёння жанчыны ўжо радзей глядзяць у свой пашпарт і практычна не чуюць стуку біялагічных гадзіннікаў, калі справа датычыцца нараджэння дзяцей. Беларускі ўсё часцей з задавальненнем пераймаюць заходнюю мадэль, паводле якой жанчыны нараджаюць пасля пабудовы кар'еры і жыцця «для сябе».
Развіццё рэпрадуктыўных тэхналогій дазволіла ўмяшацца і ў такое традыцыйна натуральнае пытанне, як нараджэнне дзяцей. Многія жанчыны хочуць атрымаць немаўля толькі тады, калі ўжо заробяць дастаткова грошай, будуць мець добрую і стабільную працу, змогуць паглядзець свет.
Акрамя таго, ёсць і тыя, хто вырашаецца на дзіця ў познім узросце і з карыслівай для сябе мэтай — існуе меркаванне, што роды амаладжваюць.
Так што атрымліваецца падвойны бонус — і дзіця з'яўляецца, і арганізм пачуваецца на мінус 10 гадоў.
Але ці падзяляюць такія тэорыі і перакананні ўрачы? І ці заўсёды трэба паўтараць заходнія прынцыпы? Пра плюсы і мінусы позняй цяжарнасці расказала ўрач акушэр-гінеколаг 11-й гарадской паліклінікі сталіцы Ірына БАРЫСЕВІЧ.

РОДЫ Ў 40 — НЕ РЭДКАСЦЬ

— Ірына Андрэеўна, якія роды лічацца познімі з медыцынскага пункта гледжання? Які ўзрост крытычны для наступлення цяжарнасці?

— Познія роды — з'ява, якая нярэдка сустракаецца ў медыцынскай практыцы апошнім часам. Сучасная медыцына адносіць жанчын, старэйшых за 35 гадоў, якія нараджаюць першае дзіця, да катэгорыі «ўзроставыя першародзячыя». Але так было не заўсёды. У сярэдзіне XX стагоддзя ідэальным узростам для нараджэння першынца лічылі 18—22 гады, а жанчын, якія ўпершыню нараджалі пасля 24 гадоў, афіцыйная медыцына называла старародзячымі.

«У многіх выпадках рызыку можна звесці да мінімуму, калі жанчына загадзя падрыхтуе сябе фізічна да гэтага працэсу».

Да канца мінулага стагоддзя найбольш спрыяльным узростам для нараджэння першага дзіцяці сталі лічыць ужо 20—25 гадоў. Далей урачы загаварылі аб тым, што да 30 гадоў жанчына можа нараджаць першае дзіця без якой-небудзь боязі, а паняцце «старародзячая жанчына» з 24-гадовага ўзросту спачатку адсунулася на 28-гадовы, далей — на 30-гадовую мяжу, а потым знікла зусім.

— Ці павялічылася апошнім часам колькасць жанчын, якія адкладаюць мацярынства на больш позні тэрмін? З чым гэта звязана?

— У нашы дні роды ў 40 гадоў перасталі быць рэдкасцю. Па статыстыцы, у перыяд паміж 30—40 гадамі жанчыны нараджаюць першае дзіця ў 3 разы часцей, чым 20 гадоў таму, а сярэдні ўзрост першародзячых жанчын у Беларусі наблізіўся да 30 гадоў.

Прынята лічыць, што «мода» на познія роды прыйшла ў нашу краіну з Еўропы і Амерыкі, дзе выходзяць замуж пасля 30 гадоў і яшчэ пазней нараджаюць першае дзіця. Гэтаму ёсць тлумачэнне — жанчына паспявае зрабіць кар'еру, рэалізаваць свае жыццёвыя патэнцыялы і толькі потым з усёй адказнасцю падыходзіць да моманту нараджэння малога.

